# Гадавая справаздача старшыні Англа-беларускага таварыства за 2012/2013 г.

ДЖЫМ ДЫНГЛІ*

Пры згадванні падзей года, які прайшоў з моманту апошняй штогадовай агульнай сустрэчы, я хацеў бы падкрэсліць адчуванне рэальнай пераемнасці ў дзейнасці Таварыства, параўноваючы яго з тым, што іншым разам называюць – я часам думаю, што занадта энтузіястычна, – ягоным “росквітам” у 1960-х і 1970-х гг.

Таварыства працягвае выконваць мэты, акрэсленыя ў ягоным статуце: “распаўсюд, абмен і публікацыя ведаў, якія маюць дачыненне да беларускага народа, яго зямлі, гісторыі і культуры”.

Непазбежна вырас дыяпазон закранутых тэмаў, з большай увагай да сучасных рэаліяў, а таксама сацыяльнага боку жыцця Таварыства. Далейшы спіс падзеяў з’яўляецца выдатным адлюстраваннем шляху, якім жыццё Таварыства было ўзбагачана прыездам маладых беларусаў у Вялікабрытанію.

Таварыства яшчэ доўга можа служыць каардынацыйным цэнтрам для пашырэння кантактаў паміж народамі Вялікабрытаніі і Беларусі. Наперадзе яшчэ шмат “часоў росквіту.”

За год Таварыства правяло наступныя сустрэчы, самастойна або супольна з іншымі арганізацыямі:

**17 траўня 2012 года** [супольна з Еўрапейскай радай па міжнародных адносінах]: **“Што робіць Беларусь такой складанай?”**, дыскусія з удзелам Эдварда Лукаса (Міжнародны рэдактар The Economist, Senior Fellow Цэнтра аналізу еўрапейскай палітыкі), Яны Кабзовай (Policy Fellow і праграмны каардынатар, ECFR) і Яраслава Крывога (Рэдактар Belarus Digest і сакратар Англа-беларускага таварыства). Мерапрыемства прайшло ў сядзібе Еўрапейскай рады па міжнародных адносінах.

**9 чэрвеня 2012 года**: лекцыя Дэвіда Марплза (ганаровы прафесар, кафедра гісторыі і класікі, Альберцкі ўніверсітэт), **“Перагляд Вялікай Айчыннай вайны ў сучаснай Беларусі”.**

* Чынны старшыня Англа-беларускага таварыства.

**23 чэрвеня 2012 года**: традыцыйнае **святкаванне Купалля (летняе сонцастаянне)**. Асобны дзякуй усім тым, хто дапамог падрыхтаваць сад, агонь і вянкі на галаву, арганізаваць спевы і танцы. Гэтая падзея і святкаванне Раства – “Каляды” цяпер традыцыйныя падзеі ў календары Таварыства.

**13 Кастрычніка 2012 года**: лекцыя Арнольда Макміліна (ганаровы прафесар Школы славянскіх і ўсходнееўрапейскіх даследаванняў Універсітэцкага коледжа Лондана і адзін з віцэ-прэзідэнтаў Англа-беларускага таварыства) **“Беларуская турэмная паэзія”.**

**24 лістапада 2012 года** (супольна са Згуртаваннем беларусаў у Вялікай Брытаніі): мерапрыемства, прысвечанае 92-й гадавіне **Слуцкага збройнага чыну**, адбылося ў памяшканні Згуртавання.

**15 снежня 2012 года**: святочная калядная **“Батлейка”**, народны лялечны тэатр, прадстаўлены Паўлам Шаўцовым і Сашай Белавокай.

**19 студзеня 2013 года**: **кінафестываль кароткаметражных фільмаў Perpetuum Mobile**, які адбыўся прыблізна ў той жа час, як фестываль у Мінску.

Для мяне вялікае задавальненне, што гэты даклад будзе ўключаны ў першы нумар адноўленага “Журнала беларускіх даследванняў”. Таварыства вельмі ўдзячнае сакратару, Яраславу Крывому, за напружаную працу, што ён уклаў, каб зрабіць аднаўленне журнала магчымым, каб той служыў яшчэ адным сродкам інфармацыі дасягнення больш шырокай публікі. Матэрыял для першага выпуска сабраны і цяпер рыхтуецца да публікацыі.

Я хачу завяршыць гэтую справаздачу аб дзейнасці Таварыства падзякай Радзе Таварыства і асабліва сакратару, Яраславу Крывому, а таксама скарбніцы, Сашы Белавокай. Без іх падтрымкі дзейны старшыня не змог бы эфектыўна працаваць.

Таварыства выказвае вялікую ўдзячнасць Згуртаванню беларусаў у Вялікай Брытаніі за іх нязменнае разуменне і падтрымку, а таксама беларускай каталіцкай місіі, у прыватнасці а. Сяргею Стасевічу, за дазвол праводзіць мерапрыемствы Таварыства на тэрыторыі місіі.